Л. М. Боханка

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Планы-канспекты ўрокаў

3 клас

II паўгоддзе

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі*

Мазыр
«Выснова»
2022

# Прадмова

Прапанаваныя ў метадычным дапаможніку планы-канспекты ўрокаў складзены згодна з дзеючымі вучэбнымі праграмамі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

*Мэта дапаможніка* — палегчыць падрыхтоўку настаўніка да ўрока ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу адпавядае зместу падручніка: Свірыдзенка В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017.

Аўтар ужывае заданні, якія стымулююць пазнавальную актыўнасць вучняў, патрабуюць самастойнага пошуку інфармацыі, яе выкарыстання для выканання вучэбных і практычных задач. Таксама прапануюцца практыкаванні на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў і правілаў правапісу, развіццё творчых здольнасцей пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Змест працы па каліграфіі звязваецца з фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

Безумоўна, матэрыял неабходна выкарыстоўваць творча, улічваючы псіхалагічныя асаблівасці вучняў, а таксама іх здольнасць успрымаць вучэбны матэрыял.

# Урок 43

## Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з (с)*

**Мэта:** фарміраванне ўяўленняў пра правапіс прыставак.

**Задачы:**

- ствараць умовы для развіцця ўменняў вызначаць прыстаўку і корань у словах, для фарміравання навыкаў правапісу слоў з прыстаўкамі, якія заканчваюцца на *з (с)*;
- садзейнічаць развіццю арфаграфічнай пільнасці, узбагачэнню слоўніка вучняў народнымі прыметамі;
- выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

**Абсталяванне:** падручнік (частка 2), карткі для індывідуальнай работы, тэст.

### Ход урока

**1. Арганізацыйны момант.**

*Зараз ты правер, дружок,*
*Ці гатовы ты пачаць урок?*
*Праверым? Сядайце,*
*Дружна працу пачынайце.*

**2. Праверка дамашняга задання.**

— Назавіце прыстаўкі. Якія літары ўставілі? Чаму?

(Некалькі вучняў працуюць па картках.)

***Картка 1.***

Запісаць словы, уставіць прапушчаныя літары, абазначыць прыстаўкі.

*А..копваць, а..мыць, а..казаць, па..рэзаць, па..карміць, па..-клеіць, а..пачыць, па..трымаць.*

***Картка 2.***

Запісаць словы, уставіць прапушчаныя літары, раздзяліць словы для пераносу.

*Па..шываць, па..пісаць, па..страгаць, а..правіць, а..думаць, па..цягнуць.*

***Картка 3.***

Спісаць тэкст, устаўляючы замест кропак прыстаўкі і абазначыць іх. У першым і другім сказах падкрэсліць галоўныя члены.

*Мы ..правіліся ў паход. Хлопчыкі ..рыхтавалі лыжы. Дзяўчынкі сабралі ўсе неабходныя рэчы і ..клалі іх у рукзак. Весела нам было ў паходзе.*

Праверка картак.

**3. Мэтаматывацыйны этап.**

*Раз-, рас-, без-, бяс-, уз-, ус-, з-, с-.*

— Расстаўце прыстаўкі па сваіх месцах.

*(Рас/раз)пісаць, (с/з)кінуць, (бяс/бяз)шумны, (уз/ус)водзіць, (раз/рас)німаць, (з/с)губіць, (без/бес)галовы, (ус/уз)міхнуцца.*

Растлумачце свой выбар, адкажыце, калі пішацца ў прыстаўках "*з*", а калі "*с*". Гэта і ёсць тэма нашага ўрока. Якія задачы будзем вырашаць?

**4. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**4.1. Чыстапісанне.**

*сз   зс   ссзз*

*Зз Сс   зс зссз ззсс*

*зрабіць   спісаць   зрубіць   зіма*

— Якое слова лішняе? (*Зіма.*) Чаму? (Слова без прыстаўкі.)

***Арфаграмы ў словах (каменціраванае пісьмо).***

*Зімой да нас завіталі завеі.*

— Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Падбярыце сінонімы да слоў "завіталі", "завеі". (*Прыляцелі; мяцеліцы, завірухі.*)

**5. Вывучэнне новай тэмы.**

**5.1. Работа па падручніку с. 14, практ. 21.**

5.2. Работа па падручніку с. 14, правіла; схема [14, л. 1].

## ПРАВАПІС ПРЫСТАВАК

| Пішуцца нязменна | аб-, ад-, над-, пад-, пра-, у-, прад-, перад-, пры-, за-, па- |
|---|---|
| абысці, адбеглі, надпісаць, падыходзіць, працягнецца, уляцелі, прадказаць, перадапошні, прычальваць, закапаць, пазнаёміцца | |

| | | |
|---|---|---|
| з-/с-, раз-/рас-, без-/бес-, уз-/ус- | з – [🔔] / [■] | зберагаць, размаўляць, безумоўны, узгадаць |
| | с – [🎧] | схапіць, расказаць, бесклапотны, ускапаць |

5.3. Складанне апорнай схемы, с. 14, практ. 22; схема [14, л. 3].

## АЛГАРЫТМ ВЫБАРУ НАПІСАННЯ З/С У ПРЫСТАЎКАХ

1. Вымаўляем слова. Вызначаем у ім корань і прыстаўку.

   У?ляцець, у?клікнуць.



2. Знаходзім першы гук кораня.

   У?ляцець – [л’], у?клікнуць – [к]. 1

3. Калі першы зычны кораня:

   – [🔔], пішам (з) → узляцець

   – [🎧], пішам (с) → усклікнуць

## Літаратура


1. Мінкевіч, Н. І. Заданні і практыкаванні да асноўных правіл па беларускай мове для 3 класа : дапам. для настаўнікаў, вучняў і бацькоў / Н. І. Мінкевіч. Мінск, 2001.

2. Солахаў, А. В. Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў установ агул. сярэд. адукацыі з белар. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. Мінск, 2012.

3. Жукава, С. А. Беларуская мова на “выдатна”. 3 клас : трэнажор. У 2 ч. Ч. 2 / С. А. Жукава. Мазыр, 2017.

4. Гімпель, І. А. Зборнік дыктантаў па беларускай мове для пачатковых класаў / І. А. Гімпель. Мінск, 1997.

5. Леўкіна, Л. Ф. Беларуская мова : давед. для пачатковых класаў: Тэорыя. Практыкаванні. Адказы / Л. Ф. Леўкіна. Мінск, 2016.

6. Рознаўзроўневыя дадатковыя заданні па беларускай мове. 3 клас / уклад. Н. Р. Маўлютава. Мазыр, 2011.

7. Беларуская мова. Сшытак для замацавання ведаў. 3 клас / уклад. В. В. Раманенка. Мінск, 2011.

8. Маладзічок. Апавяданні, вершы, загадкі, казкі, прыказкі, прымаўкі / уклад. Т. І. Фаменка. Мінск, 2009.

9. Глуша, М. Ю. Беларуская мова. 3 клас. Чароўны сшытак / М. Ю. Глуша, І. Ц. Сухаверава. 12-е выд., перапрац. Мінск : Аверсэв, 2018.

10. Загадкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі; рэд. тома А. С. Фядосік. Мінск : Бел. навука, 2004.

11. Пазнякоў, М. П. Тры чарадзеі : вершы, скорагаворкі, загадкі : для дашк. і мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. Мінск : Юнацтва, 1991.

12. Сямак, А. Л. Алімпіяды па беларускай мове. 2–4 класы / А. Л. Сямак. Мінск : Аверсэв, 2015.

13. Пракачай. Трэнажор па беларускай мове для 3 класа / [Н. Р. Маўлютава]. Мазыр : Палескае слова, 2020. 71, [1] с.

14. Схемы-апоры. Беларуская мова. 3 клас : у 2 ч. Ч. 2. Мазыр : Выснова, 2020. 20 л.

15. Там жа. Ч. 1. Мазыр : Выснова, 2020. 20 л.

16. Беларуская мова. Кантроль вучэбных дасягненняў. 3 клас : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з белар. і рус. мовамі навучання / [склад. А. М. Маладцова]. 2-е выд. Мазыр : Выснова, 2021. 50, [2] с.

# Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***з (с)*** . . . . . . . 4

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***з (с)*** . . . . . . 8

Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня . . . . . . . . 11

Апостраф у словах з прыстаўкамі . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Напісанне прыставак і прыназоўнікаў. Навучальная пісьмовая работа (сачыненне) . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

Суфікс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20

Суфікс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24

Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса . . . . . . . . . 28

Агульнае паняцце пра самастойныя і службовыя часціны мовы. Кантрольная работа па тэме “Склад слова. Правапіс прыставак. Суфікс” . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

Аналіз кантрольнай работы. Назоўнік як часціна мовы . . . 35

Кантрольны слоўнікавы дыктант. Адзіночны і множны лік назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39

Аналіз кантрольнага слоўнікавага дыктанта. Назоўнікі, якія маюць адну форму ліку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43

Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46

Род назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

Назоўнікі, у якіх нельга вызначыць род . . . . . . . . . . . 53

Назоўнікі, род якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57

Змяненне назоўнікаў па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . 60

Змяненне назоўнікаў па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . 62

Прыметнік як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . 65

Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . . . . . . . . . . . 70

Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . . . . . . . . . . . 73

Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Змяненне прыметнікаў па ліках. Тэматычны тэст “Часціны мовы. Прыметнік” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Абагульненне па тэме “Прыметнік”. Навучальная пісьмовая работа (пераказ) па тэксце Я. Галубовіча “Зоркі ў траве” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Дзеяслоў як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Дзеяслоў як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Адзіночны і множны лік дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . 94
Час дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Час дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах . . . . . . . . . 104
Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах . . . . . . . . . 108
Кантрольны слоўнікавы дыктант. Правапіс ***не*** з дзеясловамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Аналіз кантрольнага слоўнікавага дыктанта. Правапіс ***не*** з дзеясловамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Кантрольны дыктант “Разліў Нёмана” з граматычным заданнем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Аналіз кантрольнага дыктанта з граматычным заданнем. Паўтарэнне: тэкст, сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Паўтарэнне: значэнне слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Паўтарэнне: склад слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Паўтарэнне: назоўнік, прыметнік . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
Паўтарэнне: дзеяслоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142

Дадатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150